***Бамбешка І.І.*** *(Мінск)*

# ГІСТОРЫЯ КРАЯЗНАЎЧАГА ЧАСОПІСА «НАШ КРАЙ»

Адной з найбольш значных сацыяльных з'яў міжваенных дзесяцігоддзяў у Беларусі стаў краязнаўчы рух, які ахапіў шырокія слаі насельніцтва краіны. Была створана сетка краязнаўчых арганізацый: гурткі пры сельскіх саветах, школах, хатах-чытальнях, раённыя і акруговыя краязнаўчыя таварыствы. На чале гэтай структуры стаяла Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК), якое дзейнічала ў складзе Інбелкульта на правах пастаяннай камісіі, пачынаючы з 29 снежня 1923 г. У абавязкі ЦБК уваходзіла арганізацыя таварыстваў, агульнае кіраванне іх дзейнасцю, правядзенне ўсебеларускіх краязнаўчых канферэнцый і з'ездаў, падрыхтоўка і выданне навукова-даследчых прац, метадычных матэрыялаў (праграм, інструкцый і анкет) і інш.

У першы склад ЦБК увайшлі географы А.А. Смоліч і М.В. Азбукін, гісторыкі У.І. Пічэта і В.Д. Дружчыц, вучоны-прыродазнавец С.В. Скандракоў, а таксама прадстаўнікі розных дзяржаўных устаноў і арганізацый (І.А. Сербаў, А.А. Сянкевіч, А.І. Ажгірэй (паэт А. Вольны) і інш.). Прэзідыум ЦБК узначальваў А.А. Смоліч, яго наметнікам быў абраны А.А. Сянкевіч, пасаду вучонага сакратара займаў Я.І. Васілевіч [1].

У далейшым склад ЦБК неаднаразова змяняўся. У ім адначасова былі прадстаўнікі беларускага руху «нашаніўскай пары» (А.І. Смоліч, С.В. Скандракоў) і расійскай навуковай школы (І.А. Сербаў, У.І. Пічэта), заснавальнікі беларускай навукі «першага бэсэсэраўскага пакалення» (В.Д. Дружчыц, К.К. Атраховіч,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М.І. Касяровіч) і партыйныя функцыянеры (П.Р. Вілянстовіч, Р.К. Шукевіч-Траццякоў, М.І. Казак). Такім чынам, пад партыйным кіраўніцтвам супрацоўнічалі прадстаўнікі класічнай расійскай школы даследавання Беларусі і новай беларускай школы, што таксама накладвала свой адбітак. З аднаго боку, падрыхтаваныя інструкцыйна-метадычныя матэрыялы, краязнаўчыя артыкулы адрозніваліся акадэмічнай грунтоўнасцю, а з другога – беларускай накіраванасцю, што сведчыла аб зараджэнні ўласна беларускай акадэмічнай традыцыі ў гуманітарных навуках [2].

Чым актыўней працаваў ЦБК, чым шырэй разгортваўся краязнаўчы рух, тым з большай вастрынёй адчуваўся недахоп канкрэтнай арганізацыйна-метадычнай дапамогі з цэнтра [3]. Таму выявілася патрэба ў стварэнні спецыяльнага часопіса, дзякуючы якому краязнаўчыя арганізацыі і зацікаўленыя краязнаўствам асобы маглі б абмяняцца сваімі думкамі і вопытам, пазнаёміцца з новымі працамі, атрымаць метадычныя парады. Неабходнасць такога выдання падкрэслівалася на пасяджэннях І Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі (Мінск, лістапад 1924 г.), разумелі гэта і ў кіраўніцтве Інбелкульта [4].

5 сакавіка 1925 г. Прэзідыум Інбелкульта даручыў ЦБК сумесна з намеснікам старшыні Інбелкульта А.А. Смолічам распрацаваць план і каштарыс новага навукова-папулярнага краязнаўчага выдання [5]. 20 красавіка 1925 г. пытанне аб выпуску штомесячніка абмяркоўвалася на пасяджэнні Прэзідыума ЦБК. Быў зацверджаны план часопіса і прапанавана яго назва – «Шляхам краязнаўства» [6].

Было прынята рашэнне падрыхтаваць першы нумар да 1 чэрвеня 1925 г. і пры яго распрацоўцы прытрымлівацца наступнага плана: «артыкул аб заданнях краязнаўства старшыні ЦБК П.Р. Вілянстовіча, палажэнне аб краязнаўчай справе ў Беларусі, ахова помнікаў прыроды і культуры, апавяданне аб выдатных мясцовасцях Беларусі, артыкулы з акруговых таварыстваў краязнаўства, артыкулы асобных секцый ІБК, а таксама анкеты, інструкцыі і праграмы» [7]. У далейшым змест часопіса быў некалькі пашыраны.

У ліпені 1925 г. была створана часовая рэдакцыйная калегія часопіса ў складзе географа А.А. Смоліча, пісьменніка М.А. Грамыкі і даследчыка Г.С. Аляксандрава. Рэдактарам быў прызнача-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ны вядомы беларускі пісьменнік С.Я. Плаўнік (З. Бядуля) [8]. У канцы жніўня 1925 г. канчаткова было вырашана пытанне аб назве часопіса – «Наш край». Аўтарам мастацкага вырашэння вокладкі выдання стаў беларускі мастак М.Г. Эндэ, а аўтарам мастацкіх заставак і канцовак – беларускі графік А.М. Тычына, які выкарыстаў для іх распрацоўкі ўзоры беларускіх тканін і разьбы па дрэве [9].

У кастрычніку 1925 г. убачыў свет першы нумар часопіса «Наш край». Ён быў выдадзены накладам 2000 экзэмпляраў і меў 68 старонак. У рэдакцыйным артыкуле гэтага нумара вызначаліся асноўныя задачы краязнаўства: «высвятленне па новаму старых куткоў нашае мінуўшчыны і вышукванне новых куткоў», «разабрацца ў гісторыі рэвалюцыйнага руху на Беларусі і ў гісторыі новых форм быту», а таксама вывучэнне культуры, мовы, побыту і асаблівасцей розных нацыянальнасцей, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі [10]. У далейшым менавіта гэтыя ідэі сталі адной з прычын згортвання сапраўднага краязнаўчага руху і рэарганізацыі часопіса ў новае выданне «Савецкая краіна», а затым і яго закрыцця.

У першым нумары часопіса «Наш край» быў апублікаваны і прыкладны статут краязнаўчай арганізацыі, дзе вызначаліся яе мэты, задачы, структура і формы ўзаемасувязі з рознымі ўстановамі, а таксама змешчаны дзве праграмы, якія сталі тэарэтыка-метадычнай асновай дзейнасці краязнаўцаў па вывучэнні сваёй мясцовасці.

Пытанне аб часопісе «Наш край» неаднаразова ўздымалася на краязнаўчых з'ездах і пленумах ЦБК, дзе адзначалася важнасць выдання для разгортвання краязнаўчага руху, яго дастаткова высокі навукова-метадычны ўзровень, які ў цэлым задавальняў патрэбы мясцовых краязнаўцаў, павелічэнне пастаянных супрацоўнікаў і карэспандэнтаў [11]. Так, у сваім выступленні на пасяджэнні Прэзідыума ЦБК 27 кастрычніка 1926 г. С.Я. Плаўнік прыводзіў наступныя статыстычныя звесткі: за год існавання часопіса было надрукавана 30 выдавецкіх аркушаў, у тым ліку 30 артыкулаў на прыродазнаўчую тэматыку, 6 – геаграфічных, 7 – гістарычных, 10 – аб помніках старасветчыны, 8 – на тэмы быту, гігіены, санітарыі, народнай медыцыны, мовы, 4 – публікацыі па мастацтве. Акрамя таго, было апублікавана 12 метадычных арты-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кулаў, 25 праграм, інструкцый і анкет і 398 адзінак бібліяграфічнага пісання, найбольшая колькасць публікацый – 135 – змяшчалася ў раздзеле «Хроніка» [12]. Неабходна дадаць, што праз часопіс «Наш край» ЦБК падтрымлівала сувязь з краязнаўчымі арганізацыямі і навуковымі ўстановамі замежных краін і іншых рэспублік СССР: 88 нумароў часопіса перасылалася ў РСФСР, з іх 47 нумароў – у Смаленскую губерню і 26 – на Гомельшчыну; 8 – у УССР і 7 – у ЗРСФСР, 77 – у Заходнюю Еўропу [13].

Разам з тым кіраўніцтва Інбелкульта і ЦБК неаднаразова звяртала ўвагу рэдкалегіі на шэраг недахопаў: нерэгулярнасць выхаду, падвоенасць нумароў, слабую тэхніку выдання, выказваліся пажаданні змяшчаць больш папулярных артыкулаў арганізацыйнага і метадычнага зместу [14].

На старонках выдання знаходзілі адлюстраванне вынікі навуковых даследаванняў па гісторыі, прыродазнаўстве, эканоміцы і іншым галінам ведаў. Шмат артыкулаў было прысвечана арганізацыйным і метадычным пытанням. Матэрыялы з месцаў дазвалялі ўявіць маштабы разгортвання краязнаўчага руху, сведчылі аб вывучэнні мясцовымі даследчыкамі свайго рэгіёна. Так, за час выдання ў часопісе было надрукавана 64 матэрыялы агульнабеларускага характару, на рэгіянальную тэматыку – 94, метадычных артыкулаў і артыкулаў па гісторыі краязнаўства – 51, інструкцыйных матэрыялаў (інструкцыі, праграмы і анкеты) – 100, а таксама 129 паведамленняў аб развіцці краязнаўства на месцах, якія асвятлялі дзейнасць больш як 170 розных краязнаўчых арганізацый [15].

Аднак пэўныя гістарычныя паралелі дазваляюць меркаваць, што часопіс «Наш край», нягледзячы на значную колькасць арыгінальных беларускіх матэрыялаў, знаходзіўся ў сітуацыі ўзмоцненай ідэалагічнай цэнзуры. Можна згадаць зняцце з рэпертуару Беларускага дзяржаўнага тэатра п'есы Я. Купалы «Тутэйшыя», адмаўленне М.В. Доўнар-Запольскаму ў публікацыі яго працы «Гісторыя Беларусі» і іншыя прыклады [16].

Сярод грамадскіх і сацыяльных з'яў у канцы 1920-х – 1930-я гг. краязнаўства адно з першых адчула на сабе ідэалагічны ўціск. Змяненні ў культурнай палітыцы і згортванне беларусізацыі выклікалі змены ў адносінах да краязнаўства. Гэты працэс у 1929–1930 гг. набыў палітычны характар, краязнаўчаму руху папярэд-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ніх дзесяцігоддзяў і прызнаным вучоным-краязнаўцам сталі прад'яўляць сур'ёзныя абвінавачванні.

Карэнным чынам змяніліся мэты і задачы новага «савецкага рабоча-сялянскага краязнаўства», якія былі сфармуляваны ў рэдакцыйных артыкулах часопіса «Наш край» і канчаткова зацверджаны на III Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі (Мінск, студзень 1930 г.). Асноўнай задачай стала вывучэнне пяцігадовага плана і практычная дапамога ў яго выкананні [17].

Такая сітуацыя не магла не адбіцца на лёсе часопіса. Заслухаўшы справаздачу старшыні ЦБК А.З. Казака, Прэзідыум Беларускай акадэміі навук 30 кастрычніка 1930 г. канстатаваў, што часопіс «Наш край» па змесце сваёй працы не адпавядаў патрэбам сацыялістычнага будаўніцтва, праводзіў погляды самабытнасці і аказаўся пад уплывам нацыянал-дэмакратаў. Змены рэдакцыйнай калегіі былі прадвызначаны. Калі рэдактарам № 7–8 за 1930 г. яшчэ быў З. Бядуля з членамі рэдакцыйнай калегіі М.І. Бялугай і С.М. Жураўскім, то ў наступным нумары, апошнім пад назвай «Наш край» (далей часопіс стаў называцца «Савецкая краіна»), гэтыя імёны ўжо адсутнічалі, а замест рэдактара было пазначана – «рэдакцыйная калегія». У хуткім часе склад рэдкалегіі быў зменены: у яе былі ўключаны больш талерантныя да новай ідэалогіі асобы – І.Л. Гершэнбаўм, А.Я. Крукоўскі, Ф.П. Садоўскі, В.А. Самцэвіч, В.С. Серафімаў (адказны рэдактар), В.К. Шчарбакоў [18]. Некаторыя са згаданых асоб (А.Я. Крукоўскі, В.А. Самцэвіч, В.С. Серафімаў) мелі грунтоўны вопыт краязнаўчай работы і ў далейшым спрабавалі нейкім чынам прыстасаваць напрацоўкі 1920-х гг. да новых сацыяльна-эканамічных рэалій. Новая рэдкалегія павінна была накіроўваць дзейнасць выдання ў іншае рэчышча.

З лістапада 1930 г. краязнаўчы часопіс у адпаведнасці з патрабаваннямі ідэалогіі пачаў выдавацца пад іншай назвай – «Савецкая краіна». Яго тыраж быў павялічаны з 1000 да 1300 асобнікаў. Асноўныя ідэі новага выдання і яго змест былі акрэслены ў рэдакцыйным артыкуле першага нумара. Часопіс «Савецкая краіна» павінен быў стаць «магутнай бальшавіцкай зброяй пры перадзелцы краязнаўчай працы … і дапамагчы перабудаваць краязнаўчую работу па-новаму вытворчаму прынцыпу» [19]. Яму належала значная роля ў распаўсюджванні новых поглядаў на краязнаўства і выкрыцці «ворагаў народа». На старонках выдання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крытыкаваліся былыя кіраўнікі краязнаўчага руху і яго актыўныя ўдзельнікі. Матэрыялы, якія насілі выкрывальніцкі і крытычны характар, прыйшлі на змену артыкулам прыродазнаўчай і гісторыка-краязнаўчай тэматыкі.

Аднак нават такая актыўная пазіцыя часопіса не пазбавіла яго ад рэпрэсій. У дакладной запісцы Я. Сініцкага ў ЦК КП(б)Б ад 11 лютага 1933 г. давалася характарыстыка шэрагу часопісаў, у тым ліку і «Савецкай краіны» [20]. Рэдакцыя часопіса была рэзка раскрытыкавана нават за выкарыстанне тэрміна «адраджэнне» ў № 9 за 1932 г. у артыкуле «Тарфяныя рэсурсы БССР». «Рэдакцыя часопіса не можа не знаць, што лёзунг "адраджэнне" нацдэмаўскі, контррэвалюцыйны лозунг», – падкрэсліваў Я. Сініцкі [21]. На падставе гэтай дакладной запіскі 18 красавіка 1933 г. Бюро ЦК КП(б)Б прыняло рашэнне закрыць вышэйназваны часопіс і яшчэ сем выданняў. Пастановай прадугледжвалася абавязаць рэдактараў і членаў рэдкалегій пад іх персанальную адказнасць забяспечыць сапраўды бальшавіцкі кантроль за зместам часопісаў. Разам з рэдактарамі адказнасць ускладалася на кіраўнікоў тых устаноў і арганізацый, выданнем якіх з'яўляўся часопіс [22]. Такім чынам, «Савецкая краіна» ў 1933 г. перастала існаваць, што адмоўным чынам адбілася на стане краязнаўчага руху. Краязнаўчыя арганізацыя, не адчуваючы дапамогі і падтрымкі з боку Беларускай акадэміі навук і ЦБК, а таксама мясцовых дзяржаўных органаў, згортвалі сваю дзейнасць. Адзінымі цэнтрамі краязнаўчай дзейнасці яшчэ заставаліся навучальныя ўстановы.

ЛІТАРАТУРА

1. **С-ков, С.** Цэнтральнае Бюро Краязнаўства пры І. Б. К. / С. С-ков // Асьвета. 1924. № 2. С. 133 ; **Васілевіч**. Бюро краязнаўства пры Інбелкульце / Васілевіч // Савецкая Беларусь. 1924. 4 студзеня. С. 3.
2. **Унучак, А.** Узлёт і падзенне «Нашага краю» / А. Унучак // Полымя. 2009. № 1. С. 191.
3. **Пратакол** № 6 пасяджэння Прэзідыума ЦБК ад 3 чэрвеня 1925 г. // Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНА НАНБ). Ф. 67. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 161.
4. **Ад рэдакцыі** // Наш край. 1925. № 1. С. 4.
5. **Пратакол** № 7 7-га пасяджэння Прэзідыуму ІБК, які адбыўся 5 сакавіка 1925 г. // ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 25 адв.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. **Пратакол** № 5 пасяджэння Прэзідыуму ЦБК ад 20 красавіка 1925 г. // ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 148.

7. **Пратакол** № 6 пасяджэння Прэзідыума ЦБК ад 3 чэрвеня 1925 г. …

8. **Пратакол** № 21 ад 15 ліпеня 1925 г. // ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 183 адв.

9. **Грамовіч, У.** Як пачынаўся «Наш край» / У. Грамовіч // Падарожнік. 1996. № 1. С. 3.

10. **Ад рэдакцыі** …

11. **Працы** першага Усебеларускага краязнаўчага з'езду, 7–11 лютага 1926 г. Менск, 1926. С. 16 ; **Працы** другога Усебеларускага краязнаўчага з'езду, 10–13 лютага 1927 г. Менск, 1927. С 15.

12. **Дзейнасць** Цэнтральнага Бюро Краязнаўства // Наш край. 1927. № 1. С. 75.

13. **Працы** другога Усебеларускага краязнаўчага з'езду … С. 12.

14. **Пастановы** першага Усебеларускага краязнаўчага з'езду, 7–11 лютага 1926 г. у Менску // Наш край. 1926. № 2–3. С. 83 ; **Працы** другога Усебеларускага краязнаўчага з'езду … С. 15, 116–117.

15. **Ад Цэнтральнага** бюро краязнаўства // Наш край. 1929. № 10. С. 5.

16. **Унучак, А.** Узлёт і падзенне «Нашага краю» … С. 192–193.

17. **Трэцяя** Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя // Наш край. 1930. № 2. С. 54.

18. **Выпіска** з пратаколу № 29 пасяджэння Прэзідыуму Беларускай акадэміі навук 30/X 1930 г. // Наш край. 1930. № 9–10. С. 71.

19. **Садоўскі, Ф. П.** «Савецкая краіна» – барацьбіт за савецкае краязнаўства / Ф. П. Садоўскі // Савецкая краіна. 1930. № 1. С. 5–6.

20. **Дакладная** запіска Я. Сініцкага ў ЦК КП(б)Б ад 11 лютага 1933 г. аб працы часопісаў // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 6996. Арк. 14.

21. Там жа. Арк. 41.

22. **Дадатак** да пратакола № 51 § 11[а] Бюро ЦК КП(б)Б ад 18 красавіка 1933 г. Пастанова ЦК КП(б)Б аб сетцы часопісаў БССР // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 6374. Арк. 45 адв.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ